# Сарокін А. М. На ростанях Айчыннай вайны. Беларуская вёска: Ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гады): Манаграфія. Мн., 1999. 298 с.

У беларускай гістарыяграфіі шмат зроблена па вывучэнні праблемы аграрных пераўтварэнняў і сацыяльна-эканамічных змен, якія адбыліся ў беларускай вёсцы ў паслякастрычніцкія гады. Працы прысвячаліся ідэалагічнай дзейнасці камуністычнай партыі Беларусі, перспектывам развіцця вёскі, станаўленню саўгасаў, правядзенню суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі БССР і перамозе калгаснага ладу. У пасляваенныя гады гісторыкі пісалі пра развіццё калгасна-саўгаснай вытворчасці, ідэйна-палітычную працу сярод сялян і іх шлях да развітога сацыялізму.

Шматлікія ахвяры сялянскай вайны супраць савецкай улады ў 1918—1922 гг., выкліканыя адмоўнымі адносінамі часткі працаўнікоў вёскі да аграрнага курсу дзяржавы, былі аднесены да страт у гады грамадзянскай вайны. Фізічнае знішчэнне «кулацтва» ў перыяд масавага абагульнення сялянскіх гаспадарак зводзілася да праблем абвастрэння класавай барацьбы, якая прапагандавалася камуністычнай партыяй і г. д.

У 50—60-х гг. вучоныя надрукавалі шэраг артыкулаў, у якіх з пазіцыі марксісцка-ленінскай метадалогіі былі адлюстраваны асобныя бакі жыцця беларускай вёскі. Па разглядаемай тэме ў перыяд так званага развітога сацыялізму з'явіліся фундаментальныя працы М. П. Касцюка, Ю. С. Кузняцова, А. М. Сарокіна, К. К. Германа, У. А. Палуяна ды інш. Але ў іх галоўная роля ў пытаннях развіцця вёскі адводзілася партыі і яе рашэнням.

У сучасных абставінах грамадскага жыцця неабходна перагледзець ўяўленні пра сацыяльна-класавыя сілы вёскі, пераасэнсаваць вынікі перамен, якія былі ёй навязаны ў апошнія сем дзесяцігоддзяў.

Новы падыход да праблем развіцця беларускай вёскі ў 20-я гг. прадэманстраваны ў артыкулах і манаграфіі М. А. Бяспалай «Беларуская вёска ў першыя гады НЭПа (1921—1923 гг.)», выдадзенай у 1999 г. Даследчыца паказала, што новая эканамічная палітыка і зямельныя рэформы не адпавядаюць надзеям сялянства, а савецкая культура — традыцыйнай сялянскай.

Аўтар трох манаграфій, шматлікіх навуковых артыкулаў і сааўтар калектыўных прац, А. М. Сарокін вызначыў і апрабіраваў найбольш перспектыўныя методыка-метадалагічныя падыходы да аналізу праблем аграрнай гісторыі Беларусі савецкага часу, абгрунтаваў метадалагічныя прынцыпы даследавання рэпрэсіўнай палітыкі ўлады ў 1917—1980-я гг.

Кніга складаецца з уступнага слова аўтара, 16 умоўных глаў, заданняў для самакантролю (праграма спецкурса), паказальніка тэрмінаў і паняццяў і паказальніка імёнаў.

У працы разглядаецца шырокае кола складаных пытанняў гісторыі беларускай вёскі ад кастрычніка 1917 г. да канца 90-х гг. Менавіта аналізуюцца важныя праблемы аграрных пераўтварэнняў і сацыяльна-эканамічных зрухаў у беларуска-савецкай вёсцы, іх эканамічны, палітычны і прававы характар, уплыў на лёс сельскага насельніцтва.

Новым у падыходзе аўтара з’яўляецца асэнсаванне падзей мінулага і іх раскрыццё ў сувязях з сучаснасцю, што надае працы маштабнасць і актуальнасць. А. М. Сарокін разгляд сацыяльнай з’явы пачынае з вызначэння зместу і прасочвае яе эвалюцыю да 90-х гг. Упершыню ў адной працы даецца тлумачэнне ўсім найбольш значным тэрмінам, звязаным з аграрнай праблематыкай.

Цікавасць уяўляе і факт, што аўтар пры аналізе матэрыялаў не навязвае чытачу «грунтоўных» высноў, а накіроўвае на паглыбленае вывучэнне тэмы. Манаграфія, напісаная на аснове шырокага кола літаратурных і архіўных крыніц, матэрыялаў перыёдыкі, мемуараў, дае для творчай працы вялікія магчымасці.

Названая акалічнасць павінна быць улічана выкладчыкамі і студэнтамі ВНУ пры вывучэнні пэўных тэм па гісторыі, эканоміцы і культуры Беларусі, палітычнай сацыялогіі ды іншых дысцыплінах. Гэта дапаможа ім крытычна ставіцца да падзей мінулага, а магчыма, звярнуцца непасрэдна да першакрыніц з мэтай спасцігнуць прычыны крызісных з’яў, што сёння існуюць у аграрным сектары.

Асвятленне і глыбокі аналіз вузлавых з’яў жыцця беларускай вёскі ў манаграфіі А. М. Сарокіна будзе карысным для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

*М. М. Забаўскі*, кандыдат гістарычных навук, дацэнт